

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №6 (14)
Красавік 2021

## У нумары:

| | |
|---|---|
| **Віншуем пераможцаў!** | **Стар. 1** |
| **Школьны аздараўленчы лагер “Вясёлка”** | **Стар. 2** |
| **Акцыя “Эстафета дабрыні”** | **Стар. 3** |
| **Піянерская анлайн-субота** | **Стар. 3** |
| **ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна** | **Стар. 4** |
| **“Міншчына спартыўная - За Беларусь!”** | **Стар. 5** |
| **Тыдзень спорту і здароўя** | **Стар. 5** |
| **Навіны дзіцячага сада** | **Стар. 6** |

## Віншуем пераможцаў!

Маглена Максім, вучань 9 класа, заняў 3 месца ў раённым аглядзе-конкурсе дзіцячай творчасці “Выратавальнікі вачамі дзяцей” (намінацыя “Апавяданне”).






Сертыфікат удзельніка атрымалі Сцябуля Дзмітрый, вучань 7 класа, і Даўгаполаў Аляксандр, вучань 8 класа, за ўдзел у завочным этапе X Раённай краязнаўчай алімпіяды.






Віншуем вучняў з заслужанымі ўзнагародамі і жадаем ім далейшых творчых поспехаў!!!

# Школьны аздараўленчы лагер “Вясёлка”

У перыяд вясновых канікул з 29 сакавіка па 3 красавіка ва ўстанове адукацыі працаваў аздараўленчы лагер "Вясёлка", які наведвалі 10 навучэнцаў школы. Дзеці весела і з карысцю праводзілі час, прымаючы актыўны ўдзел у самых разнастайных мерапрыемствах:

- хвілінкі здароўя "Што рабіць, каб не захварэць?", "Аптэка пад нагамі", "Калі хочаш быць здаровым - загартоўвайся!", "Дзіцячы траўматызм"






- хвілінкі бяспекі "Адзін дома", "Дарогі, знакі", "Электрапрыборы: іх бяспечнае выкарыстанне", "Сцежка небяспечных месцаў", "Правілы пажарнай бяспекі", "Правілы паводзін з незнаёмымі людзьмі", "Мы і інтэрнэт"






- конкурс чытальнікаў “Родная мова, цудоўная мова”, прагулкі і рухомыя гульні на свежым паветры, наведванне школьнага музея, экскурсія ў Цэнтр народных рамёстваў і Цэнтр турызму і краязнаўства і шмат іншых цікавых мерапрыемстваў.











# Акцыя “Эстафета дабрыні”

Піянеры нашай школы прынялі актыўны ўдзел у акцыі "Эстафета дабрыні", у рамках якой былі праведзены работы па навядзенні належнага парадку побач з помнікам героям, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Таксама адбылося ўскладанне кветак.









“Эстафета дабрыні” была перададзена дзяржаўнай установе адукацыі "СШ №1 г.Фаніпаль".

# Піянерская анлайн-субота

Па традыцыі піянеры Дзяржыншчыны кожную другую суботу месяца збіраюцца наа паседжанне ў анлайн-рэжыме ў рамках рэалізацыі праекта "Піянерская субота".

Піянерская субота 10 красавіка была арганізавана нашай піянерскай дружынай “Бліскавічка”. Мы падрыхтавалі самапрэзентацыю, у якой прадставілі нашы дасягненні ў розных галінах дзейнасці дружыны, правялі гульню-віктарыну “Паехалі!”, прысвечаную Дню касманаўтыкі.

Затым піянеры Дзяржыншчыны прынялі актыўны ўдзел у працоўным дэсанце.

Эстафету прыняла піянерская дружына дзяржаўнай установы адукацыі “Вялікасельскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – базавая школа”.





# ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна

8 красавіка для вучняў 8-9 класаў прайшоў адзіны дзень інфармавання ў рамках рэспубліканскага праекта "Школа Актыўнага Грамадзяніна" на тэму: "Аб духоўных і маральных каштоўнасцях: дыялог пакаленняў".

Класны кіраўнік 9 класа Баркоўская Галіна Іванаўна пазнаёміла вучняў зместам інфармацыйнага блоку, прэзентацыяй.

На дадзеным мерапрыемстве прысутнічаў ганаровы госць – Сіняўская Эмілія Мікалаеўна, настаўніца пачатковых класаў, ветэран педагагічнай працы. Эмілія Мікалаеўна расказала навучэнцам пра свой жыццёвы і прафесійны шлях.

Адзіны дзень інфармавання прашоў прадуктыўна. Вучні прынялі актыўны ўдзел у абмеркаванні прапанаваных пытанняў. Дыялог пакаленняў адбыўся.





22 красавіка для вучняў 8-9 класаў зноў прайшоў адзіны дзень інфармавання ў рамках рэспубліканскага праекта "Школа Актыўнага Грамадзяніна" на тэму: "Ёсць у кожнай перамозе тваёй і маёй вясна сорак пятага года".

Класны кіраўнік 8 класа Клімовіч Марыя Антонаўна пазнаёміла вучняў са зместам наступных інфармацыйных блокаў: “Якой цаной Перамога нам дасталася, ты памятай – ніколі не забывай!”, “Памятаць дзеля будучыні”.

У бязлітасным агні Вялікай Айчыннай вайны загінулі разам з жыхарамі 627 беларускіх вёсак. У Брэсцкай вобласці - 111, Гомельскай - 70, Магілёўскай - 108, Віцебскай - 222, Мінскай - 92, Гродзенскай - 24 вёскі. 186 вёсак больш не змаглі адрадзіцца. Фашысты і іх мясцовыя памагатыя не шкадавалі нікога: ні нямоглых старых, ні немаўлятаў.

У летапісе Беларусі не было бітвы больш жорсткай, чым Вялікая Айчынная вайна, не было подзвігу больш значнага, чым подзвіг савецкага салдата, які абараніў Радзіму ад ворага, які выратаваў чалавецтва ад нацызму. Памяць аб страшнай вайне і Вялікай Перамозе не можа загаснуць: яна навечна ўпісана ў гісторыю Айчыны і кожнай беларускай сям'і. Перажытая трагедыя і дасягнутая Перамога - вечная крыніца болю і горычы, гонару і славы беларускага народа.





# “Міншчына спартыўная – За Беларусь!”




15 красавіка прадстаўнікі нашай школы прынялі ўдзел у лёгкаатлетычным забегу "Міншчына спартыўная - За Беларусь!". Дадзенае мерапрыемства праходзіла ў новым фармаце: не на спартыўным аб'екце, а ў адным з самых прыгожых куткоў нашага горада - у мікраараёне "Родники" каля возера.

На мерапрыемстве прысутнічала начальнік упраўлення па адукацыі, спорту і турызму Дзяржынскага райвыканкама Галіна Уладзіміраўна Гапанькова.

Як праходзіў забег - глядзіце ў нашым фотарэпартажы.







# Тыдзень спорту і здароўя

З 12 па 16 красавіка ў школе праходзіў Тыдзень спорту і здароўя. Вучні прымалі ўдзел у самых разнастайных спартыўных мерапрыемствах, праяўляючы сваю сілу і спрыт. Самыя спартыўныя вучні на ўрачыстай лінейцы былі ўзнагароджаны дыпломамі.

Імі сталі сярод дзяўчат: Даўгаполава Таццяна, вучаніца 6 класа (1 месца); Саўчук Аліна, вучаніца 9 класа (2 месца); Ярашэвіч Мар’яна, вучаніца 6 класа (3 месца).

Сярод юнакоў: Даўгаполаў Аляксандр, вучань 8 класа (1 месца); Сцебуля Дзмітрый, вучань 6 класа, і Маглена Максім, вучань 9 класа (2 месца); Ажаль Дамінік, вучань 6 класа (3 месца).

Віншуем пераможцаў і жадаем ім не спыняцца на дасягнутым !!!









# Навіны дзіцячага сада

## Дзень касманаўтыкі

2 красавіка ў дзіцячым садзе прайшоў тэматычны Дзень касманаўтыкі. Выхавальнік рознаўзроставай групы Пратасевіч Святлана Сяргееўна расказала выхаванцам аб Ю.А.Гагарыне, які ў 1961 годзе здзейсніў першы палёт у космас, пазнаёміла дзяцей з планетамі сонечнай сістэмы. Дзеці праявілі свае творчыя здольнасці: зрабілі сумесную аплікацыю "Ракета" і інсцэніравалі палёт на Месяц.

Дзень касманаўтыкі прайшоў весела і карысна !!!








## Занятак па выяўленчай дзейнасці

З мэтай тлумачэння і напамінання правілаў бяспечных паводзін на дарозе ў рознаўзроставай групе дзіцячага саду 20 красавіка прайшоў занятак па выяўленчай дзейнасці на тэму "Дзеці-дарога-бяспека".

У ходзе дадзенага занятку дзеці пад кіраўніцтвам выхавальніка Пратасевіч Святланы Сяргееўны паўтарылі і замацавалі правілы пераходу праезжай часткі дарогі, а таксама правілы бяспечных паводзін на дарогах. Вынікам занятку сталі вясёлыя святлафоры, намаляваныя выхаванцамі дзіцячага саду.











Рэдкалегія: вучні 9 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 9 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 31 мая.